***Секцыя 7***

## УНЁСАК РОДУ РАГОЙШАЎ У ВЫВУЧЭННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ФАЛЬКЛОРУ
***(да 75-годдзя Вячаслава Рагойшы)***

---

***Таццяна Шамякіна***

### ВЯЧАСЛАЎ РАГОЙША І ЯГО РОД У ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ

*Аўтар ў артыкуле адсочвае, як месца нараджэння і шматлікія сувязі са светам культуры свайго народа уплываюць на станаўленне асобы, сям'і, роду. У гэтым кантэксце аналізуецца род сучаснага беларускага вучонага і пісьменніка Вячаслава Рагойшы і яго родны Ракаў, заснаваны ў XIV ст.*

***Tatsiana Shamyakina***

### VIACHASLAU RAGOYSHA AND HIS FAMILY IN THE TIMES AND THE TERRITORY

*The author of the article traces the effect of birth and place numerous links with the world of culture of the people on the formation of the individual, family, genus. The author analyzes in this context the family of modern Belarusian scientist and writer Vyacheslav Ragoysha and his hometown of Rakov, found in the 14th century.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2017 годзе грамадскасць Беларусі адзначае важную дату – 75-годдзе з дня нараджэння выдатнага даследчыка, тэарэтыка літаратуры, гісторыка літаратуры, перакладчыка, пісьменніка з шырокім творчым дыяпазонам, прафесара Вячаслава Пятровіча Рагойшы.

Род Рагойшаў паходзіць з мястэчка Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Упершыню назва паселішча на месцы сучаснага Ракава сустракаецца ў XIV ст., калі польскі кароль Казімір Ягелон падарыў горад канцлеру Вялікага Княства Літоўскага Міхалу Кяжгайлу. Але можна меркаваць, што людзі тут жылі з часоў неаліту, пра што сведчыць размешчанае на ўскрайку мястэчка старадаўняе гарадзішча. І назва ідзе, безумоўна, з глыбіні тысячагоддзяў. Яе этымалогію можна выводзіць ад старажытнай назвы сонца – Ра, а можна звязаць са словам "рака», бо паселішча знаходзіцца на беразе халоднай, але надзвычай прыгожай Іслачы. Марфемы, што ўвайшлі ў дадзеныя назвы («ра» і «сла») сталі часткамі імені і прозвішча юбіляра – Вячаслава Рагойшы. Сапраўды, Вячаслаў Пятровіч і яго сям'я асабліва кроўнымі сувязямі паяднаны з роднымі мясцінамі, са сваім "умяшчальным ландшафтам". Цяжка знайсці сярод інтэлігенцыі сучаснай Беларусі чалавека, так апантанага любоўю да малой радзімы, як Рагойша.

Не толькі квітнеючая прырода, на толькі сонца ў сваёй узыходзячай магутнасці закладалі свае жыватворныя энергіі ў дзіця, якое нарадзілася на пачатку лета – 5 чэрвеня 1942 г., але і гісторыя, што нагадвала пра сябе на кожным кроку па меры сталення асобы.

Мястэчка Ракаў дасягнула свайго росквіту ў XVII ст. Відаць, было гандлёвым цэнтрам пасярод сельскагаспадарчага рэгіёна. Нават у савецкі час (1950-я гады) славіліся ракаўскія кірмашы. Гэта быў і важны канфесійны цэнтр. Так, у 1686 г. тут заснаваны Дамініканскі каталіцкі манастыр, а ў 1702 г. – уніяцкі Базыльянскі. У 1793 г. пабудаваны выдатнейшы помнік архітэктуры ў стылі барока – Спаса-Праабражэнская царква, якая і сёння дзейнічае. Тут жа – Ракаўскі касцёл Маці Божай (1906 г.) у стылі неаготыкі, які таксама з'яўляецца значным помнікам дойлідства цэнтральнай часткі Беларусі. Былі і сінагогі, бо здаўна пасяляліся ў мястэчку яўрэі, якія адчувалі сябе камфортна сярод надзвычай талерантнага беларускага насельніцтва. Выключнай талерантнасцю заўсёды адрознівалася і сям'я Рагойшаў. Сам Вячаслаў Пятровіч – чалавек самых шырокіх поглядаў, памяркоўны беларус і еўрапеец-гуманіст, які прыязна прымае і ўбірае ў сябе ўсе дасягненні чалавечай культуры. На прыкладзе Рагойшаў цікава было б прасачыць, як уплывае родная мясціна, а таксама шматлікія сувязі са светам на станаўленне чалавека, сям'і, роду.

У 2008 г. Вячаслаў Пятровіч склаў кнігу твораў – вершаў, успамінаў, доследаў – сваіх родных дзядзькаў – Кастуся і Антося Рагойшаў. У Каментарыі да лірыкі, эсэ і некаторых дакументаў Вячаслаў Пятровіч распавядае пра свой радавод. У архівах ён дашукаўся да сярэдзіны XVIII ст., знайшоўшы згадку пра першага з роду – Фёдара Рагойшу.

На першы погляд здаецца, што прозвішча Рагойша ўгора-фінскае. Насамрэч, у ім выразна праглядаецца спрадвечны індаеўрапейскі корань «ра» – самае старажытнае не толькі ў егіпцян, але і ў нашых продкаў імя сонца. Марфема ўвогуле надзвычай распаўсюджаная ў шмат якіх словах розных моў на тэрыторыі Еўразіі. Другая марфема ў прозвішчы – «гой» – на санскрыце «чалавек». Атрымоўваецца «сонечны чалавек». Марфема «ша» нярэдка ў індаеўрапейскіх мовах замянялася на «са» і азначала злучэнне. Само слова падкрэслівае, што паяднанне канатацый у ім арганічнае. Сонечнасць надзвычай стасуецца і да вобліку Вячаслава Пятровіча, і да яго дзейнасці. Не мае значэння, ці правільнае маё тлумачэнне з пункту гледжання класічнай этымалогіі, – яно дакладнае па глыбіннай сутнасці.

Продкі Рагойшы, як ён высветліў, спачатку былі ўніятамі, потым каталікамі і праваслаўнымі. Гэта натуральна ў такім шматканфесійным мястэчку. Знойдзена сведчанне, што ў 1865 г. адзін з Рагойшаў выкупіў у памешчыка трынаццаць дзесяцін зямлі. Захаваліся і дакументы, як сяляне вёскі Пярэжары ў 1911 г. судзіліся з памешчыкам з-за пашы: тут згадваецца Іосіф Рагойша. Каталік, ён ажаніўся з праваслаўнай. І потым усіх сваіх дзяцей хрысціў у праваслаўе, бо так патрабавалі законы Расійскай імперыі.

З шасці дзяцей Іосіфа старэйшы Пётр – бацька Вячаслава. Сам ён лаканічна піша ў Каментарыі, што бацька яго нарадзіўся 12 ліпеня 1914 г. у Пярэжах, пад Ракавам, павету Маладзечна. Закончыў пры паляках поўны курс навук у Народнай земляробчай школе (нешта накшталт сельскагаспадарчага тэхнікума). Вучыўся і паводзіў сябе вельмі добра. Ужо пасля ўстанаўлення савецкай улады ў 1939 годзе, «калі на базе школьнай гаспадаркі арганізавалі адзін з першых у Заходняй Беларусі калгасаў, калгаснікі абралі П.І. Рагойшу сваім старшынёй. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў

старшынёй Выганіцкага сельсавета, затым – ажно да выхаду на пенсію – калгасным бухгалтарам у Ракаве. Пахаваны на Ракаўскіх праваслаўных могілках».

Больш падрабязна ў мемуарных нататках «Светлы след» піша пра Пятра яго малодшы брат Антось, навуковец-матэматык, які ўсё жыццё выкладаў у Гродзенскім універсітэце. У прыватнасці адзначае: «Цяга Пеці да зямлі, раслін і жывёл, старанныя адносіны да вучобы выдзялялі яго сярод вучняў. Ён быў выдатнікам, лепшым вучнем школы». Такім жа выдатнікам у вучобе заўсёды быў адзіны сын Пятра – Вячаслаў (залаты медаль у школе, дыплом з аднакай у БДУ). А таксама сыны самога Вячаслава Пятровіча.

Нельга не прывесці і тыя радкі Антося Рагойшы, дзе гаворыцца пра гераічныя ўчынкі яго брата падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пётр быў партызанскім сувязным. Яго выдалі, арыштавалі, везлі на расстрэл, але ён збег. Факт паказальны – сведчыць пра смеласць і знаходлівасць. «Калі савецкія войскі вызвалілі Міншчыну, Пецярйўлі ўліўся ў Чырвоную Армію, ваяваў у складзе сапёрных часцей. Пад агнём праціўніка наладжваў водныя пераправы, разміраваў мінныя палі, рэзаў загароджы з калючага дроту і г.д. Бог ратаваў ад смерці. Быў цяжка паранены пры штурме Кёнігсберга. Вызваляў ад фашыстаў Польшчу, Германію. На Эльбе сустрэўся з амерыканскімі войскамі. Узнагароджаны медалямі «За Отвагу», «За взятие Кёнигсберга» і інш.»

Шмат якія рысы характару – упартасць, волю, мужнасць, прынцыповасць – Вячаслаў Пятровіч узяў ад бацькі. Ды і падобны да яго знешне. Ён ганарыцца сваім родам і не раз сведчыў гэта ў розных інтэрв'ю.

Ганарыцца і жонкай. Гаворыць: «Гэта і любоў мая з маладых гадоў, і жонка верная, і сяброўка шчырая, і клапатлівая маці маіх сыноў. Мы ўплывалі (і ўплываем дагэтуль) адзін на аднаго – і ўплываем разам на дзяцей...»

Таццяна Вячаславаўна Кабржыцкая нарадзілася ў Кіеве ў сям'і служачых. У час Вялікай Айчыннай вайны яе сям'я была эвакуіравана ў Алма-Ату, а з 1946 г. пасялілася ў Львове, дзе Таццяна Вячаславаўна скончыла філалагічны факультэт Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І.Франка. Пазнаёміліся Вячаслаў Пятровіч і Таццяна Вячаславаўна на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў Адэсе, пяць гадоў перапісваліся, а ў 1967 г. узялі шлюб. Іх вяселле Адам Мальдзіс назваў «вяселлем веку». На ім прысутнічалі выдатнейшыя, можна сказаць, знакавыя асобы для беларускай культуры, у прыватнасці Уладзімір Караткевіч, памяць пра якога сям'я Рагойшаў шануе, як, можа, ніхто ў краіне.

З 1971 г. па 1980 г. Кабржыцкая працавала навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, а з 1980 г. па 2016 г. – спачатку дацэнтам кафедры рускай літаратуры, затым кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ. Член Саюзаў пісьменнікаў і Беларусі, і Украіны.

Надзвычай хутка Таццяна Вячаславаўна авалодала, побач з роднымі ўкраінскай і рускай, беларускай мовай, пачала актыўна выступаць у друку з артыкуламі і рэцэнзіямі. Разам з В.П.Рагойшам выдала манаграфіі «Карані дружбы: Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі пачатку ХХ ст.», «Слядамі знічкі: Пра Сяргея Палуяна», «Кантакты», «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя ў сістэме ўсходнеславянскай літаратурнай супольнасці», хрэстаматыю «Мае браты, мае суседзі: творы пісьменнікаў бліжняга замежжа».

Апошні па часе праект Вячаслава Пятровіча разам з Таццянай Вячаславаўнай – трохтомны вучэбны дапаможнік «Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі». Трэці том выйшаў да 95-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2016 г.). Першая частка (2012 г.) была прысвечана гісторыі ўкраінскай літаратуры ад Сярэднявечча да канца XVIII ст., другая (2015 г.) ахоплівала стагоддзе – ад пачатку новай украінскай літаратуры да першых гадоў ХХ ст. У трэцім томе разглядаецца развіццё ўкраінскай літаратуры ад 40-х гг. ХХ ст. да пачатку ХХІ ст. Але хоць вучэбны дапаможнік – па ўкраінскай літаратуры і прызначаны найперш для студэнтаў-украіністаў, але змест яго адметны, можна сказаць, унікальны: украінскі літаратурны працэс, разгледжаны на працягу стагоддзяў, паказваецца ў непасрэднай сувязі са станаўленнем і развіццём украінска-беларускіх культурных, найперш літаратурных, сувязей. Прычым сувязі аказаліся вельмі значнымі і шматаспектнымі. Яны засведчылі і братэрства нашых народаў, і іх несумненнае спадчыннае культурнае багацце.

За прапаганду ўкраінскай літаратуры ў Беларусі Таццяна Вячаславаўна, як і Вячаслаў Пятровіч, адзначаны Міжнароднай літаратурнай прэміяй імя Івана Франко (2000 г.). Т.В.Кабржыцкая ўганаравана таксама ордэнам княгіні Вольгі.

Тры сыны Вячаслава Пятровіча і Таццяны Вячаславаўны – такія ж прыгожыя, працалюбівыя, таленавітыя, як і бацькі. Усе маюць вышэйшую адукацыю, а малодшы – Пятро – і не адну: філалагічную і юрыдычную. Усевалад Вячаслававіч і Пётр Вячаслававіч – кандыдаты філалагічных навук, займаюць, як і сярэдні з братоў гісторык Максім, значныя пасады.

Мне пашчасціла даволі працяглы час працаваць на кафедры беларускай літаратуры і культуры разам з Усеваладам Вячаслававічам – яркай індывідуальнасцю, надзвычай абаяльнай асобай. Уражвае, перш за ўсё, гнуткі розум Усевалада, яго жалезная логіка, уменне праводзіць аналогіі паміж самымі рознымі літаратурнымі, культурнымі з'явамі, рабіць слушныя абагульненні. Вось чаму ён заўсёды нязменна праводзіў экспертызы дысертацый маладых даследчыкаў. Больш за тое, абсалютна бескарысліва дапамагаў ім. Ёсць дысертацыі, дзе канцэпцыя, структура, высновы – усё «падорана» дысертантам Рагойшам-малодшым. Увогуле на кафедры Сева, як мы называлі яго, выручаў заўсёды, быў аўтарам шматлікіх крэатыўных праектаў.

Нявестка Рагойшаў Эла Юр'еўна Дзюкава, жонка сярэдняга сына Максіма, таксама кандыдат філалагічных навук, працуе на кафедры славянскіх літаратур філфака БДУ. Такім чынам, у адной сям'і чатыры кандыдаты навук і адзін доктар – сам Вячаслаў Пятровіч. Бадай, немагчыма знайсці ў Беларусі такую ж унікальную сям'ю, усе члены якой – сапраўдныя арыстакраты духу.

Але ёсць у Рагойшы яшчэ адно любімае дзецішча – кафедра тэорыі літаратуры, якую ён стварыў і больш за дваццаць гадоў узначальваў.

Кафедра пачала функцыянаваць 1 верасня 1994 года на філфаку БДУ і да сёння з'яўляецца адзінай падобнага кшталту ў рэспубліцы, што, безумоўна, павышае прэстыж філалагічнага факультэта і ўсяго ўніверсітэта, паколькі тэорыя літаратуры з'яўляецца квінтэсенцыяй літаратуразнаўства і вызначае метадалогію і методыку літаратурнай творчасці.

Акрамя тэарэтыкаў літаратуры – самога Вячаслава Пятровіча, Анатоля Мікалаевіча Андрэева, Міхася Паўлавіча Кенькі, Святланы Іванаўны Крыловай і аўтара дадзенага артыкула – на кафедры працуе моцны калектыў фалькларыстаў у складзе Рымы Мадэстаўны Кавалёвай, Вольгі Віктараўны Прыемка і некалькіх маладых даследчыкаў. Гэта Таццяна Анатольеўна Марозава, Таццяна Валерьеўна Лук'янава, Славяна Вячаславаўна Шамякіна. У 2016 г. у склад кафедры ўвайшлі доктар філалагічных навук, фалькларыст Ірына Валер'еўна Казакова і аўтарка гэтых радкоў, Таццяна Іванаўна Шамякіна.

Але, на самай справе, гэта маё вяртанне на сваю, без перабольшання, працоўную «радзіму", бо працавала на кафедры тэорыі літаратуры на працягу ўсіх 1990-х гадоў, з'яўляючыся намеснікам Вячаслава Пятровіча. У плане адчування



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задавальнення ад працы гэта былі мае залатыя гады. Вячаслаў Пятровіч здолеў стварыць такую творчую атмасферу ў калектыве, што нам усім было пры ім выключна камфортна і ўтульна. І гэта пры тым, што якраз 1990-я гады – надзвычай цяжкія ў плане эканамічным, грамадскім, палітычным. Але цяжкасці – за сценамі БДУ. Мы ж на кафедры не адчувалі ніякіх антаганізмаў, непаразуменняў, працавалі дружна і радасна, з пастаянным адчуваннем клопату загадчыка пра нас. Сам Вячаслаў Пятровіч быў заўсёды вельмі далёкі ад інтрыг, плётак, асабістых прыхільнасцей – заўсёды роўны, спакойны з усімі, нязменна добразычлівы да кожнага. Дзякуючы яго намаганням абараніў доктарскую дысертацыю А.М.Андрэеў і стаў на кафедры прафесарам; абараніла доктарскую дысертацыю я, прычым менавіта пад кіраўніцтвам Вячаслава Пятровіча. Прайшлі паспяховыя абароны многіх і многіх кандыдацкіх дысертацый. На кафедры працуе аспірантура па тэорыі літаратуры, аспірантура па фалькларыстыцы і практычна арыентаваная аспірантура па тэксталогіі.

Пры тым, што на кафедры чытаюцца шматлікія і ў многім унікальныя, менавіта намі найперш створаныя, вучэбныя дысцыпліны, яна мае найперш кірунак навукова-акадэмічны. Акрамя выдатных навуковых манаграфій уласна па тэорыі літаратуры, тут і фальклорыстычная секцыя таксама займаецца ў першую чаргу даследаваннямі тэорыі фальклору, чым не можа пахваліцца, шчыра кажучы, ні адна іншая навуковая і вучэбная структура ў краіне. Пры кафедры створана навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору, якая ў сваёй дзейнасці скіравана ўжо на практычны бок – апрацоўвае шматлікія фальклорныя шэдэўры, што збіраюць нашы студэнты па распрацаванай на кафедры ўнікальнай методыцы. Па багацці сабраных матэрыялаў, а галоўнае, па хуткасці іх апрацоўкі лабараторыя не мае канкурэнтаў у Беларусі. Кафедра разам з лабараторыяй з 1999 г. праводзіць штогадовыя рэспубліканскія «Шырмаўскія чытанні", была ініцыятарам правядзення міжнародных навукова-практычных канферэнцый «Фальклор і сучасная культура", «Мова – літаратура – культура" і іншых.

На кафедры рыхтуюцца перыядычныя зборнікі навуковых прац, якія карыстаюцца велізарным попытам у навукоўцаў рэспублікі (а таксама за яе межамі) і студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў: «Актуальная праблемы тэорыі літаратуры і фальклору», «Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі», «Фалькларыстычныя даследаванні». Выходзілі і аднаразовыя зборнікі, напрыклад, "Восточнославянский фольклор: поиски новых подходов». У большасці зборнікаў навуковы рэдактар – Вячаслаў Пятровіч Рагойша.

Можна яшчэ на шматлікіх старонках пералічаць дасягненні кафедры тэорыі літаратуры ў навуковай, педагагічнай (у тым ліку мы арыентуемся і на школу), выхаваўчай сферах. Работа па арганізацыі ўсіх аспектаў працы кафедры праароблена Вячаславам Пятровічам як яе кіраўніка каласальная. Яго праца ацэнена – шматлікімі граматамі, дыпломамі, ордэнам Францыска Скарыны. А галоўнае, ён заслужыў выключную павагу і любоў нас, сваіх калег і студэнтаў. Мы, выкладчыкі літаратуры, лічым В.П.Рагойшу найперш нашым навуковым бацькам, але і нашым хросным бацькам у многіх іншых галінах дзейнасці, якімі нам даводзіцца займацца. Ён – мудры дарадца. Ён – карыфей. Ён – адзін з самых дасведчаных людзей у рэспубліцы ў галіне літаратуразнаўства. З ім цяжка каго-небудзь паставіць побач. Яго аўтарытэт велізарны. І няма сумнення, што В.П.Рагойша яшчэ парадуе ўсіх нас новымі творчымі дасягненнямі.

***Адам Мальдзіс***

**ТРАКТ НАД ІСЛАЧЧУ Ў ЛЁСАХ РАГОЙШЫ І КАРАТКЕВІЧА: АД «ВЯСЕЛЛЯ ВЕКУ» ДА «ШЭРАГА ЗАМКА РАКАЎСКАГА»**

***Adam Maldzis***

**THE WAY OVER ISLACH IN RAGOYSHA'S AND KARATKEVICH'S DESTINIES:FROM «THE WEDDING OF CENTURY» TO «THE RAKAU GRAY CASTLE»**

*Аўтар артыкула аналізуе ўзаемасувязі родных мясцін і лёсу літаратуразнаўцы Вячаслава Рагойшы з асабістым лёсам і творчасцю пісьменніка Уладзіміра Караткевіча/*

*The author of the article analyzes the interrelations of his native places and the destiny of literary critic Vyachaslau Ragoysha with the destiny and creativity of the writer Uladzimir Karatkevich.*

Часам шляхі ды мясціны, праз якія яны праходзяць, амаль містычна аб'ядноўваюць, зводзяць разам, перакрыжоўваюць ці, наадварот, разводзяць лёсы, біяграфіі, легендарныя і міфалагічныя (ці міфалагізаваныя праз пэўны час) здарэнні, якія ўплываюць на мастацтва, культуру, самасвядомасць творчай супольнасці, генерацыі, народа, нацыі. Шлях, тракт, дарога – адзін з найбольш загадкавых і цікавых феноменаў і ў рэчаіснасці, і ў вербальна-мастацкім друкаваным адбітку рэчаіснасці – літаратурным помніку.

75-годдзе майго старога сябра, доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вячаслава Рагойшы, якое прыпадае на 2017 год, абуджае ў памяці надзвычай змястоўную панараму вобразаў, першыя з якіх, напэўна, гэта – Ракаў ды «Ракаўскі шлях», адпаведна, – назва мястэчка, дзе «родавыя карані» Рагойшаў, ды назва краязнаўчай газеты, заснаванай В.Рагойшам для папулярызацыі культурнай спадчыны 550-гадовага паселішча, дзе ён нарадзіўся. З XV стагоддзя праз Ракаў (ён атрымаў Магдэбурскае права ў XVII-м) праходзіў старажытны гандлёвы шлях Мінск – Вільня, т.зв. «Чорны тракт» [1, с. 9, 124], жыццё на якім буяла некалькі стагоддзяў, апрадметваючы і аздабляючы наваколле... Невыпадкова шэраг «рагойшава-ракаўскіх» вобразаў з'яўляецца працягам дзейнасці мінулага, кракаўскага прафесара Мар'яна Здзяхоўскага (яго маёнтак быў тут у XIX – XX стст.); Элізы Ажэшкі (яна неаднойчы гасцявала ў Здзяхоўскіх); Івана Шамякіна, Ніла Гілевіча, Язэпа Семяжона, Сяргея Панізніка (і многіх іншых творцаў, якія гасцявалі ў доме творчасці беларускіх пісьменнікаў «Іслач», пабудаваным за паўтара кіламетра ад Ракава – у т.зв. «шэрым замку Ракаўскім»); і, натуральна, постацямі геніяльнага Уладзіміра Караткевіча і яго адданай спадарожніцы – гісторыка і археолага Валянціны Нікіцінай. Адбываецца так таму, што менавіта ў Ракаве, на вяселлі Вячаслава Рагойшы і Таццяны Кабржыцкай, і пасля яго асабліва зблізіліся Уладзімір і Валянціна, а лёсы сем'яў Рагойшаў і Караткевічаў першы раз «спалучыліся» над Ракаўскім мінска-віленскім трактам, што потым адбывалася яшчэ неаднойчы...

А ў лістападзе далёкага 1967 года вяселле маладога тады беларускага літаратуразнаўцы Вячаслава Рагойшы з украінкай Таццянай Кабржыцкай, таксама філолагам, усе мы дружна найменавалі «вяселлем веку». З Львова ў Беларусь прыехалі бацькі маладой — урач і заслужаны артыст. З Мінска — Міхась Ларчанка, Алег Лойка, Язэп Семяжон, Фёдар Янкоўскі. Захоўваліся многія старыя абрады, у тым ліку і выкраданне нявесты, дзяльба каравая. Спяваліся беларускія, украінскія, рускія, польскія песні. Уладзімір Караткевіч жвава вытанцоўваў полечку з Валянцінай Нікіцінай, ды так, што яна нават зламала абцас, і ўвогуле быў завадатарам усялякіх «хохмаў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ